ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай і замежнай літаратуры

Праводзяць
МІЖНАРОДНУЮ НАВУКОВУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

XIII ТАНКАЎСКІЯ ЧЫТАННІ,

прысвечаныя Году гістарычнай памяці і 110-годдзю Максіма Танка

Канферэнцыя адбудзецца **16 верасня 2022 года**

Праблемнае поле

- ✓ Творчасць Максіма Танка: нацыянальны, еўрапейскі, сусветны кантэкст.
- ✓ Новыя аспекты рэцэпцыі творчасці Максіма Танка.
- ✓ Паэтыка твораў Максіма Танка: традыцыі і наватарства.
- ✓ Лінгвістычныя аспекты асэнсавання спадчыны Максіма Танка.
- ✓ Нацыянальна-культурны, літаратуразнаўчы і лінгвістычны кампаненты сучаснай адукацыйнай прасторы.
- ✓ Беларуская і сусветная літаратуры на мяжы тысячагоддзяў: традыцыі і перспектывы.
- ✓ “Настаўнік, перад імем тваім…”: актуальныя пытанні літаратурнай адукацыі (круглы стол да 90-годдзя з дня нараджэння Я.В. Перавознай).

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі просім дасылаць да **7 верасня 2022 года** на **E-mail**: maksimtank1912@gmail.com. Матэрыялы дакладаў – да **20 верасня 2022 года** на **E-mail**: maksimtank1912@gmail.com.

Выданне зборніка матэрыялаў плануецца па выніках канферэнцыі.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў канферэнцыі адбудзецца **16 верасня 2022 года з $9^{\underline{00}}$ да $10^{\underline{00}}$, БДПУ, корпус 2, аўд. 482**. *Канферэнцыя адбудзецца ў вочным і завочным фарматах.*

Кантактныя тэлефоны:
8-017-311-22-17 (кафедра беларускай і замежнай літаратуры).
+375-29-259-12-58 (Мішчанчук Ірына Мікалаеўна).
+375-29-506-00-64 (Жышкевіч Алёна Ігараўна).

Патрабаванні да афармлення матэрыялаў:

Аб’ём даклада – 4 старонкі, набраныя ў рэдактары Word for Windows, захаваныя ў фармаце RTF праз 1 інтэрвал шрыфтам Times New Roman 14, палі – 2,5 см. Першы радок справа – ініцыялы і прозвішча аўтара, горад. Наступны радок – назва матэрыялу. Праз радок друкуецца тэкст матэрыялу, з абзацным адступленнем 1,25 см. Спасылкі даюцца ў тэксце ў квадратных дужках. Першая лічба – нумар са спіса літаратуры, наступныя лічбы – старонкі. Напрыклад: [7, с. 132]. Спіс літаратуры даецца пасля асноўнага тэксту ў алфавітным парадку.

Арганізацыйны камітэт пакідае за сабой права адбору і рэдагавання матэрыялаў.

Выданне зборніка дакладаў плануецца па выніках канферэнцыі.

Праезд і пражыванне ў Мінску за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі
“XIII ТАНКАЎСКІЯ ЧЫТАННІ”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку _____
2. Назва даклада_____
3. Месца працы, пасада_____
4. Вучоная ступень, вучонае званне _____
5. Адрас для перапіскі (з указаннем індэкса) _____
6. Тэлефоны (з указаннем кода) _____
7. E-mail _____
8. Патрэба ў забеспячэнні жыллём _____
9. Патрэба ў сродках мультымедыйнай прэзентацыі _____

Дата_____ Подпіс_____

АРГКАМІТЭТ